*Анатоль Літвіновіч*

# ГІСТАРЫЧНАЕ МІНУЛАЕ І ТРАДЫЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСАЎ І ЛІТОЎЦАЎ У ПУБЛІКАЦЫЯХ ЯНА ВІТАРТА

Адным з даследчыкаў, які асаблівую ўвагу звярнуў на гістарычнае і культурнае ўзаемадзеянне беларусаў і літоўцаў быў Ян Міхал Вітарт (Witort). Гэтае імя да апошняга часу было, бадай, невядомае ў беларускай фалькларыстыцы, этнаграфіі, гісторыі. Падаецца, сёння важна ўвесці яго ў навуковы ўжытак. Дык хто ж такі Ян Вітарт і якое месца яго гістарычная і культурная спадчына займае ў нашай навуцы? Адразу заўважу: звестак пра яго жыццё і творчую дзейнасць захавалася не так і шмат. Нарадзіўся ён у 1853 г. у ваколіцах Панявежа (Літва). Ён з'яўляўся літаратарам, этнографам, даследчыкам традыцыйнай культуры літоўцаў, беларусаў, палякаў і іншых народаў Расійскай імперыі. Быў рэвалюцыянерам-народнікам. У 1-й палове 80-х гадоў XIX ст. быў адным з рэвалюцыйных народнікаў Пецярбурга і належаў да нелегальнага гуртка студэнтаў Польшчы і Літвы. Вучыўся ва ўніверсітэце г. Тарту (Дэрпт), тэхналагічным інстытуце Пецярбурга. У 1873-1875 гг. падтрымліваў сувязь з народнікамі Вільні (Вільнюса), дзе арганізаваў народніцкі гурток, якім кіраваў. Па гэтай прычыне ў 1875-1878 і 1881-1886 гадах быў сасланы ў Архангельскую губерню і Сібір, дзе яго не прымушалі працаваць фізічна, і ён меў адносна спрыяльныя ўмовы, каб займацца навуковымі даследаваннямі. У гэтых рэгіёнах Расіі назіраў і фіксаваў старадаўнія (у аснове сваёй яшчэ дахрысціянскія) вераванні славянскіх і неславянскіх народаў, пэўных сацыяльных слаёў насельніцтва. Пазней Вітарт напісаў некалькі артыкулаў, у якіх падзяліўся сваімі ўражаннямі аб асаблівасцях традыцыйнай культуры народаў, на тэрыторыі якіх ён пражываў у свой час. Можна згадаць некалькі з іх. Напрыклад, «Родавыя знакі архангельскіх сялян» (1896 г.), «Матэрыял да гісторыі забабонаў. Расстрэл халеры ў Сібіры ў 1892 г.» (1896 г.). У 1886 годзе пасяліўся ў г. Панявежы (цяпер г. Панявежас).

Для нас асаблівую цікавасць і значэнне ўяўляе праца «Нарысы звычаёвага права літоўскага народа» (Львоў), надрукаваная ў 1897 г. у львоўскім этнаграфічным часопісе «Lud» («Народ»). Пра гэтае даследаванне Яна Вітарта мала хто ведае з вучоных, якія займаюцца вывучэннем нашага гістарычнага мінулага, бо не спасылаюца на яго ў сваіх працах.

Хочацца больш канкрэтна спыніцца на гэтай працы. Даследуючы звычаёвае права літоўскага народа, ён указвае на розныя ўплывы на Літву і літоўцаў у Сярэднявечы і Новы час. Аўтар падкрэслівае, што асабліва моцнымі былі ўплывы беларускія, г.зн. беларускі фактар наймацней уздзейнічаў на продкаў сучасных літоўцаў. Вітарт зазначае, што яны праяўляліся ў кірунку распаўсюджання ўсходняга (праваслаўнага) веравызнання, а таксама цесна звязанага з ім візантызму (візантыйскай культуры, адзення, звычаяў, музыкі, літаратуры і інш.), беларускай мовы, дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў, звычаяў і нораваў. Даследчык піша, што вялікія князі літоўскія аддавалі перавагу ўсходняму духавенству (асабліва гэта было прыкметным да часоў Ягайлы – А.Л.) і актыўна ўмешваліся ў яго справы (Гедзімін, Альгерд). Апошні, дарэчы, пад канец свайго жыцця, на думку А.П. Грыцкевіча, прыняў праваслаўе. Распаўсюджанне праваслаўя, справядліва падкрэсліваў Вітарт, было амаль ідэнтычным распаўсюджанню беларушчыны. Указваў на афіцыйны характар беларускай мовы XIV-XVII ст. у ВКЛ. Беларуская мова, на яго думку, стала мовай двара, дыпламатыі, адміністрацыі і вышэйшага класа і ўжывалі яе ў Літве амаль да канца XVII ст. Трэба адзначыць, што шэраг беларускіх і польскіх даследчыкаў (Свірка і інш.) указвае на тое, што беларуская мова насіла афіцыйны характар не толькі на тэрыторыі Беларусі і Літвы, але і Ўкраіны (Северская зямля, Кіеўшчына, Падолія, Валынь) ў XIV – 60-х гадах XVI ст. Я. Вітарт адзначаў працэс асіміляцыі літоўцаў у беларусаў на працягу стагоддзяў. Важна падкрэсліць, што працэс абеларушвання балтаў (літоўцаў) у беларусаў адбываўся як да Люблінскай, так і пасля Люблінскай уніі і прынясце часткай першых праваслаўя, што пацвярджаюць сучасныя даследаванні.

Свае працы змяшчаў у польск. часопісах «Lud», «Wisła» («Вісла»), «Przegląd Powszechny» («Усеагульны агляд»), «Ateneum» («Атэнэум») і інш. Шэраг артыкулаў прысвяціў вывучэнню светапогляду людзей першабытнага грамадства. У даследаванні «Першабытная філасофія. (Анімізм)» [3] прывёў шмат звестак аб старажытных вераваннях беларусаў, літоўцаў і інш. народаў. Сюды ж можна залічыць наступныя працы: «Матэрыл да гісторыі сям'і (Левірат)» (Львоў, 1896 г.), «Нарыс першабытнага права» (Варшава), «Jus primae noctis» (1897 г.), «Матэрыял да культурных перажыткаў (Выяўленчае пісьмо)» (1897 г.). У артыкуле «Куцця на Літве» [2] Вітарт указаў, што гэтая вячэра на Літве і Русі (Беларусі – А.Л.) напярэдадні Раства Хрыстова па-старому называецца «куццёй», а ў палякаў Віргіліяй або Зоркай. Яго пяру належаць таксама такія публікацыі: «Этнаграфія і найноўшыя даследаванні над літаратурай» (1897 г.), «Статыстыка і этнаграфія» (1899 г.), «Са стэпаў Сярэдняй Азіі» (1899 г.), «Апавяданне з Панявежа» (1902 г.) і «Апавяданне з Панявежа» (1903 г.) і інш. У раздзел «Пошукі» месячніка «Wisła» дасылаў часам матэрыялы па духоўнай культуры беларусаў. Змясціў рэцэнзіі ў часопісах «Lud» [1] за 1896 г. і «Wisła» [4] (1897 г.) на кнігу А. Багдановіча «Перажыткі старажытнага светасузірання ў беларусаў». Гэтыя ў нечым блізкія і адрозныя між сабой рэцэнзіі ўзаемна дапаўняюць адна другую і ўяўляюць цікавасць для даследчыка, бо доўгі час заставаліся па-за ўвагай сучаснай беларускай фалькларыстыкі і этнаграфіі. З аднаго боку, Вітарт указвае на тэндэнцыйнасць і гістарычную несапраўднасць некаторых высноў этнографа адносна нашага народа (беларусы, маўляў, стаяць па сваім культурным узроўні ніжэй за рускіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і ўкраінцаў)[1, с. 210]. З другога боку, сцвярджае, што кніга А. Багдановіча будзе карыснай для даследчыкаў сваім багатым фактычным матэрыялам. У рэцэнзіях многія з’явы культуры беларусаў Вітарт спрабуе параўнаць з аналагічнымі з’явамі суседніх народаў. Культ сонца, зямлі, вады, каменя, хлеба, змяі (вужа) характэрны не толькі беларусам, але літоўцам і палякам (з апошнімі -- паўночнымі і заходнімі суседзямі нашы продкі асабліва зближаюцца сваім змяіным культам). Паданні аб гарах, якія зніклі, паглынуўшы сабой цэрквы або касцёлы, ўласцівы беларусам і літоўцам. Крык савы і крука (груга, ґругана) як у беларусаў, так і ў іх паўночных суседзяў (літоўцаў), паводле Яна Вітарта, прадракаў няшчасце. Душы нехрышчоных дзяцей, згодна з беларускімі і польскімі народнымі павер’ямі, заўважаецца ў рэцэнзіі, ператвараюцца ў русалак. Народныя вераванні аб душы, якую беларусы і літоўцы ўяўляюць ў выглядзе матэрыяльнай субстанцыі, што вандруе па свеце, упырах і памерлых, што страшаць людзей, таксама ўласцівы гэтым двум народам. Паданні пра папараць-кветку, падкрэсліваецца ў рэцэнзіі, вядомы як палякам, так і літоўцам. Павер’і аб лятаючых змеях, якія прыносяць пэўным людзям грошы, распаўсюджаны ў літоўцаў і беларусаў. Гэтыя два этнасы маюць шмат агульнага і ў народных святах (напрыклад, Купала і інш.).

Такім чынам, Ян Вітарт унёс значны ўклад у даследаванне культурнага і гістарычнага мінулага беларусаў і літоўцаў, і яго працы не страцілі сваёй цікавасці і навуковай каштоўнасці для сучаснай навукі.

**Спіс літаратуры:**


1. Witort, J. [Recenzja] // Lud. 1896. Rocz. 2. – S. 210-217. – Rec. ks.: Богданович А. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов : Этнографический очерк. – Гродно, 1895. – 186 с.
2. Witort, J. Kucya na Litwie // Lud. 1897. Rocz. 3. – S. 1-3.
3. Witort, J. Filozofia (Animizm) // Lud. 1900. Rocz. 6. – S. 7-26, 113-126, 225-245, 321-340, 1901. T. 7. – S. 1-29.
4. Witort, J. [Recenzja] // Wisła. 1897. – T. 11. – S. 580-591. – Rec. ks.: Пережитки древнего миросозерцания у белорусов : Этнографический очерк. – Гродно, 1895. – 186 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ